ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна"
Цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# ЁСЦЬ ПА СУСЕДСТВЕ БІБЛІЯТЭКА

*З вопыту работы бібліятэкі-філіяла №3*

Гродна
2016

# ЁСЦЬ ПА СУСЕДСТВЕ БІБЛІЯТЭКА…

Бібліятэка-філіял № 3 дзяржаўнай установы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна” – цэнтр сямейнага чытання – гэта цудоўнае месца, дзе сустракаюцца дзеці і дарослыя, пляцоўка, дзе нараджаюцца цікавыя ідэі і смелыя праекты ў абслугоўванні карыстальнікаў кнігай. Установа дзейнічае ў буйнейшым мікрараёне города Фолюш.

Супрацоўнікі бібліятэкі: Сотнікава Іна Вісарыёнаўна (загадчык бібліятэкі-філіяла), Случанкова Алена Міхайлаўна (бібліятэкар 2 катэгорыі), Нагорная Ларыса Пятроўна (бібліятэкар 2 катэгорыі) кваліфікавана падыходзяць да абслугоўвання карыстальнікаў. Яны валодаюць прафесійнымі ведамі, уменнямі і навыкамі ў вобласці бібліятэчнай справы, бібліяграфіі, літаратуры, псіхалогіі і педагогікі, сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, што прымяняюцца ў бібліятэчнай практыцы.

Прыцягненне да чытання і прапаганда кнігі, стымуляванне інтарэсу да беларускай і сусветнай літаратурнай спадчыны ў карыстальнікаў, сямейнае чытанне, арганізацыя вольнага часу наведвальнікаў – **асноўныя напрамкі работы** бібліятэкі. Менавіта на іх выкананне накіраваны намаганні бібліятэкараў шляхам прадастаўлення шматлікіх інфармацыйных, адукацыйных і культурна-асветніцкіх бібліятэчных паслуг.

Бібліятэкары выкарыстоўваюць розныя сродкі і формы работы ў абслугоўванні наведвальнікаў. Для іх характэрна невычэрпная выдумка ў правядзенні шматлікіх інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў, прысвечаных кнізе і чытанню. Многія з задумак вельмі цікавыя і карысныя для чытачоў.

# КАРЫСТАЛЬНІКІ БІБЛІЯТЭКІ

“Мне вельмі лёгка працаваць з маімі чытачамі, знаходзіць агульныя тэмы для размовы і дапамагаць ім у забеспячэнні інфармацыйных патрэб, – ***гаворыць загадчык бібліятэкі Іна Вісарыёнаўна Сотнікава,*** – і для мяне вельмі важна не толькі прыцягнуць наведвальніка ў бібліятэку, але і захаваць яго як пастаяннага чытача”.

**Карыстальнікамі бібліятэкі** з’яўляюцца жыхары мікрараёна Фолюш, студэнты і навучэнцы каледжаў, ПТВ і ВНУ, педагагічныя і

медыцынскія супрацоўнікі, служачыя і рабочыя. Наведваюць установу людзі сталага ўзросту і з абмежаваннямі па здароўі.

Штогод бібліятэка абслугоўвае больш за 3 тысячы дарослых і дзяцей. **Асноўнымі чытачамі** бібліятэкі з'яўляюцца ўсё ж дзеці (каля 2 тысяч чалавек).

Вельмі часта бібліятэкары наведваюць дашкольныя ўстановы з мэтай прыцягнення да чытання дзяцей з самага ранняга дзяцінства. Пастаяннымі чытачамі бібліятэкі сталі выхаванцы ДУА "Яслі-сад №№ 46, 47, 66, 68". Штогод з ДУА "Яслі-сад № 46" складаецца каардынацыйны план работы па абслугоўванні выхаванцаў кнігай.

У школьным узросце разам з сям'ёй на фарміраванне дзіцяці аказвае ўплыў школа, яе адукацыйная дзейнасць. Таму работа бібліятэкараў вядзецца ў каардынацыі з агульнаадукацыйнымі школамі мікрараёна. Кожны год бібліятэка-філіял № 3 складае сумесныя планы інфармацыйна-масавай работы з бібліятэкамі ДУА "Сярэдняя школа № 20, 37" і ДУА "Гімназія № 3".

Штогод **кнігавыдача** ў бібліятэцы складае амаль 70 000 экз. дакументаў (у т.л. дзецям – 25 000 экз.). **Чытачы наведваюць** бібліятэку каля 25 000 разоў у (у т.л. дзеці – больш за 7 000).

## ФОНД БІБЛІЯТЭКІ

Універсальны **фонд бібліятэкі** налічвае больш за 52 000 экз. кніг, перыядычных выданняў, электронных дакументаў і інш.

Якаснае фарміраванне фонду і поўнае забеспячэнне інфармацыйных патрэб карыстальнікаў – аснова дзейнасці бібліятэкі-філіяла № 3. Установа стала не проста захавальніцай фондаў, а і мабільным сацыяльным і інфармацыйным цэнтрам, запатрабаваным грамадствам.

Для наведвальнікаў бібліятэкі арганізаваны адкрыты доступ да фонду бібліятэкі. Да паслуг карыстальнікаў дзейнічае фонд экспрэс-абанемента і камерцыйных выданняў, асобна выдзелены фонд дзіцячай літаратуры і новых паступленняў.

Вялікая ўвага надаецца папаўненню фонду бібліятэкі. Мэтанакіраванаму камплектаванню садзейнічаюць штогадовыя аналізы складу і выкарыстання фонду, работа па скарачэнні адмоў чытачам. Нават пры недастатковым фінансаванні, кожны бібліятэкар зацікаўлены ў набыцці новых выданняў.

Шмат увагі ўдзяляецца падпісцы на перыядычныя выданні, якія актыўна выкарыстоўваюцца як крыніца аператыўнай інфармацыі. Штогод

у бібліятэку паступае ў сярэднім 40 назваў перыядычных выданняў: 8 – газет і 32 – часопісаў.

Для рэкламы фонду бібліятэкі распаўсюджваюцца спісы новых паступленняў літаратуры сярод навучэнцаў ДУА "Сярэдняя школа №№ 20, 37" і ДУА "Гімназія № 3" г. Гродна.

Акрамя таго, з інфармацыяй пра новыя кнігі і перыядычныя выданнямі, што паступілі ў фонд бібліятэкі наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца на Дошцы інфармацыі. Там жа да ўвагі чытачоў прадстаўлена рубрыка "Што сёння карыстаецца попытам", дзе змяшчаюцца матэрыялы пра самыя папулярныя і запатрабаваныя выданні.

Складаюць супрацоўнікі і тэматычныя рэкамендацыйныя спісы літаратуры, якія падчас наведвання бібліятэкі прапануюцца чытачам.

Для папулярызацыі цікавых літаратурных твораў бібліятэкары ствараюць буктрэйлеры – рэкламныя ролікі пра кнігі. Так, у мінулым годзе, быў зроблены буктрэйлер пра кнігу У. Стайрана "Выбар Сафі", а ў бягучым годзе – пра зборнік вершаў Л. Палеес "Не прывучай мяне да сябе…".

## ВЫХАВАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

Вялікае значэнне для бібліятэкараў мае працэс навучання чытачоў правілам карыстання бібліятэкай, уменню самастойна арыентавацца ў яе фондах і працаваць з дакументамі. З гэтай мэтай у бібліятэцы ў апошнія гады былі праведзены ўрокі бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў:

- "Пра кнігу і бібліятэку";
- "Ключы ад энцыклапедый";
- "Па старонках перыядычных выданняў";
- "Газеты і часопісы для дзяцей";
- "Кніга – твой лепшы сябар".

Змястоўным быў інфармацыйна-бібліяграфічны ўрок "Падарожжа ў свет кнігі", які адбыўся ў мінулым годзе. У бібліятэку прыйшлі вучні 5 "А" класа СШ № 20. Школьнікаў пазнаёмілі са структурай установы, яе фондам. Ім была прадстаўлена інфармацыя пра гісторыю развіцця кнігі. Бібліятэкар чытальнай залы Нагорная Л.П. пазнаёміла дзяцей з сістэмай каталогаў і картатэк бібліятэкі і правіламі карыстання імі. Таксама школьнікі даведаліся пра паслугі цэнтра прававой інфармацыі. Вялікую цікавасць выклікалі ў вучняў навінкі перыядычнага друку і новыя кнігі,

што паступілі ў фонд бібліятэкі. Пасля мерапрыемства дзеці з задавальненнем зарэгістраваліся ў бібліятэцы і ўзялі дамоў кнігі, якія іх найбольш зацікавілі.

А на мерапрыемства “Цудоўны свет бібліятэкі” былі запрошаны вучні другіх класаў ДУА “Гімназія № 3”. Дзецям давялося пазнаёміцца з Бібліядамавіком, які расказаў як трэба сябе паводзіць у бібліятэцы і як правільна карыстацца кнігамі. Потым школьнікі з задавальненнем адказвалі на пытанні віктарын і разам з бібліятэкарамі стварылі для бібліятэкі “Кнігу пажаданняў”. Прадоўжылася мерапрыемства літаратурнай варажбой і цукеркалатарэяй.

Пастаянна бібліятэкары вучаць сваіх чытачоў карыстацца электронным каталогам і ІБД “Эталон”, знаёмяць з даведачным апаратам бібліятэкі, дзеля таго, каб яны маглі свабодна арыентавацца ў кніжным свеце.

Акрамя таго, наведвальнікі бібліятэкі могуць звярнуцца за дапамогай у пошуках інфармацыі да супрацоўнікаў бібліятэкі і, несумненна, атрымаюць дзейсныя і карысныя рэкамендацыі.

## ВЫСТАВАЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Кніжныя і творчыя выстава** спрыяюць раскрыццю кніжнага фонду, папулярызацыі лепшых літаратурных твораў, прыцягненню наведвальнікаў да чытання і ўяўляюць сабой частку інтэр’еру бібліятэкі. Хочацца адзначыць, што да афармлення выстаў бібліятэкары падыходзяць крэатыўна, адказна і скрупулёзна.

Для дзіцячага чытача рыхтуюцца яркія, маляўнічыя выставы, якія змяшчаюць казкі, легенды і паданні, прыгодніцкую літаратуру, выданні пра жывёльны і раслінны свет і г.д.:

- “Юбілейны карагод”;
- “Цудоўныя казкі для салодкіх сноў”;
- “Кніжны дождж” (панарамная выстава ў вокнах бібліятэкі).

Для таго, каб прыцягнуць моладзь да чытання і кнігі, афармляюцца выставы з сучаснай, папулярнай у моладзевым асяроддзі літаратурай:

- “Чытаць модна!”;
- “Свет часопісаў – ён твой!”;
- “Будзь у фармаце – чытай беларускае”.

Не застаюцца без увагі і дарослыя чытачы. На кніжных выставах яны могуць знасці цікавую і карысную інфармацыю па медыцыне, кулінарыі, кветкаводству, мастацкія і дакументальныя творы:

- “Добры свет любімых кніг”;
- “Па старонках цікавых часопісаў”;
- “Карысная інфармацыя і прыемны вольны час”.

Значная ўвага пры арганізацыі кніжных выстаў удзяляецца памятным датам краіны, юбілеям беларускіх і сусветных пісьменнікаў, кнігам-юбілярам.

Адметнай рысай выставачнай работы ў філіяле № 3 з’яўляецца арганізацыя **творчых выстаў**. У апошнія гады да ўвагі наведвальнікаў былі прапанаваны:

- “Пазнай сябе ў бібліятэцы” – выстава фотаздымкаў чытачоў бібліятэкі ў Дзень бібліятэк Рэспублікі Беларусь;
- “Горад стары, горад новы” – фотавыстаўка пра Гродна;
- “Гэта было нядаўна, гэта было даўно” – выстава рэтра-паштовак;
- “Кнігі і лялькі” – экспазіцыя;
- “Куфар казак” – экспазіцыя і інш.

## СЯМЕЙНАЕ ЧЫТАННЕ

“У нас чытаюць дзеці, таму што іх адукацыя пачынаецца з роднай мовы і кнігі. Чытаюць іх таты і мамы, адпачываючы тым самым ад напружанай рэчаіснасці. Кніга заўсёды нязменна суправаджае самае старэйшае пакаленне. І наша галоўная задача – зябяспечыць чытачоў інфармацыяй і літаратурай па ўсіх пытаннях жыццядзейнасці сям’і,” – ***гаворыць І.В. Сотнікава***.

Прыярытэтным напрамкам работы бібліятэкары філіяла абралі **сямейнае выхаванне**: прыцягненне бацькоў і дзяцей да кнігі і развіццё іх творчага супрацоўніцтва, адраджэнне традыцый сямейнага чытання. На іх погляд, ва ўмовах негатыўнага ўздзеяння сучаснай сацыякультурнай і інфармацыйнай сітуацыі, паслаблення ролі кнігі ў сямейным выхаванні, непадрыхтаванасці бацькоў да ўдзелу ў развіцці дзяцей як чытачоў асабліва актуальным становіцца ўзаемадзеянне бібліятэкі і сям’і, сумеснае абслугоўванне бацькоў і дзяцей.

Бібліятэкары працуюць з сем’ямі ў розных напрамках:

- інфармацыйная падтрымка сямейнага чытання;
- фарміраванне педагагічнай культуры бацькоў;
- дапамога сем’ям у псіхалагічных і прававых пытаннях;
- развіццё творчага супрацоўніцтва дзяцей і бацькоў.

Разумеючы, што бібліятэка – лепшы стымулятар самаадукацыі і выхавальнік культуры чытання дзяцей, бібліятэкары праводзяць вялікую работу па папулярызацыі чытання і рэкламе кнігі сярод падрастаючага пакалення.

Бібліятэкары імкнуцца выхаваць у дзяцей любоў да кнігі, навучыць іх радавацца кожнай сустрэчы з любімымі і новымі літаратурнымі героямі, творамі, навучыць бацькоў любіць чытаць і дапамагчы ім выхаваць дзяцей удумлівымі чытачамі (гл. Дадатак № 1). Яны заклікаюць бацькоў: “Давайце чытаць разам! Давайце раскажам дзецям, што чытанне – адзін з самых цікавых заняткаў на свеце!”.

Супрацоўнікі бібліятэкі прыцягваюць да сумеснага чытання не толькі мам і тат, але і бабуль і дзядуль праз арганізацыю сямейных свят, сумесных гучных чытанняў, конкурсна-гульнёвых праграм, дзейнасць клубаў па інтарэсах і г.д.

“Сумеснае чытанне кнігі і абмеркаванне прачытанага збліжае членаў сям’і, яднае іх духоўна,” – ***лічаць супрацоўнікі бібліятэкі***.

Бібліятэкары шмат увагі надаюць індывідуальнаму кіраванню чытаннем, вывучаюць інтарэсы і запыты чытачоў (тэматыку і жанравыя перавагі дзяцей і дарослых). Так, самыя маленькія чытачы любяць чытаць казкі, кнігі пра жывёл, прыроду, прыгодніцкую літаратуру, творы сучасных беларускіх дзіцячых пісьменнікаў. Інтарэсы дзяцей featured разнабаковыя, што адлюстроўваецца і на іх чытанні. Пры папаўненні фонду бібліятэкары выбіраюць лепшыя выданні для дзяцей, спрыяючы тым самым прыцягненню дзяцей да сістэматычнага чытання.

Супрацоўнікі бібліятэкі прыкладаюць усе намаганні, каб дзеці, заходзячы ў бібліятэку, абавязкова даведаліся пра нешта новае і папоўнілі свой багаж ведаў.

Значная ўвага ўдзяляецца інфармацыйнай падтрымцы сямейнага чытання: бацькам прапануюцца рэкамендацыйныя спісы літаратуры па розных тэмах, якія адлюстроўваюць лепшыя перыядычныя выданні і кнігі для сумеснага чытання з дзецьмі (гл. Дадатак № 2).

Для бацькоў і дзяцей у бібліятэцы былі арганізаваны змястоўныя кніжныя выставы:

- “Мой кроха і я”;
- “Пра сям’ю і для сям’і”;
- “Прапануем дзецям і бацькам”.

У чытальнай зале дзейнічае кніжная выстава “Чытайце разам! Чытайце ўслых!”, на якой прадстаўлены добра вядомыя і любімыя дзіцячыя творы. Яркім дапаўненнем да іх сталі ілюстрацыі, створаныя лепшымі мастакамі дзіцячай кнігі. Упрыгожваюць кніжную выставу лялькі любімых літаратурных герояў.

• • •

Самымі ўлюбёнымі ў наведвальнікаў бібліятэкі застаюцца сямейныя святы, што ладзяцца да Дня сям’і і Дня маці. Так, у мінулым годзе ў Дзень сям’і адболося фальклорнае свята “Калі ў доме лад – не патрэбен і скарб”. А потым быў арганізаваны дзень вясёлых задумак і сямейнага чытання “Сямейнаму чытанню – наша павага”.

У Дзень маці адбылося свята “Сэрца для матулі”. Яно ладзілася для выхаванцаў ДУА “Яслі-сад № 46” і іх мам. Падчас мерапрыемстваў гучалі цёплыя словы пра светлае пачуццё любові і павагі да жанчыны-маці. Для дзяцей, матуль і бабуль былі арганізаваны цікавыя конкурсы і віктарыны.

У бягучым годзе бібліятэкарамі быў праведзены шэраг мерапрыемстваў у межах рэспубліканскай акцыі “Сямейнае чытанне”:

- “Падарожжа на Востраў сямейных радасцяў” (конкурсна-гульнёвая праграма);
- “Праблемы ўзаемаадносін у сям’і” (гучнае чытанне і абмеркаванне твора В. Асеевай “Бабка”);
- “Нашы чытачы – дарослыя, падлеткі, малышы…” (фотавыстава) і інш.

## РАБОТА З ПАДЛЕТКАМІ І МОЛАДДЗЮ

Бібліятэкарамі накоплены вялікі вопыт работы **з падлеткамі і моладдзю.**

Значную частку карыстальнікаў бібліятэкі складае юнацтва і моладзь: вучні старэйшага школьнага ўзросту, студэнты ПТВ і ВНУ. Сярод гэтай катэгорыі карыстальнікаў запатрабавана навуковая, навукова-папулярная літаратура, энцыклапедычныя і даведачныя выданні.

Супрацоўнікі імкнуцца забяспечыць наяўнасць такой літаратуры ў фондзе бібліятэкі.

У рабоце з моладзевай аўдыторыяй бібліятэкары вырашаюць наступныя задачы:

- стымуляванне інтарэсу да чытання і кнігі;
- садзейнічанне павышэнню інтэлектуальнага і культурнага ўзроўню;
- выхаванне прававой культуры і актыўнай жыццёвай пазіцыі;
- садзейнічанне эстэтычнаму, духоўнаму, патрыятычнаму выхаванню і выхаванню здаровага ладу жыцця.

Студэнты і старэйшыя школьнікі разглядаюць бібліятэку не толькі як крыніцу атрымання інфармацыі, неабходную ў працэсе адукацыі і самаадукацыі, але і як месца камфортных зносін з сябрамі. Яны з'яўляюцца частымі наведвальнікамі масавых мерапрыемстваў і пасяджэнняў клубаў па інтарэсах, што дзейнічаюць у бібліятэцы.

## АБСЛУГОЎВАННЕ САЦЫЯЛЬНА-НЕАБАРОНЕНЫХ КАТЭГОРЫЙ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

Асаблівая ўвага супрацоўнікаў бібліятэкі-філіяла № 3 ўдзяляецца абслугоўванню **сацыяльна-неабароненых катэгорый** карыстальнікаў.

Усё больш становіцца ў бібліятэцы **чытачоў сталага ўзросту**, у якіх свае перавагі і захапленні. Гэта група наведвае бібліятэку, у асноўным, дзеля зносін, актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах і творчых сустрэчах.

Штогод бібліятэку наведваюць каля 400 людзей пенсіённага ўзросту, кнігавыдача ім складае амаль 20 000 экз. дакументаў.

Людзі сталага ўзросту вельмі розныя і для таго, каб паспяхова працаваць з імі бібліятэкары ўлічваюць іх сацыяльнае становішча, асаблівасці характару, духоўныя патрэбы, стан здароўя і іншае.

Асноўным спосабам правядзення вольнага часу для пажылых людзей застаецца чытанне мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры. Пажылыя людзі маюць магчымасць браць літаратуру з чытальнай залы на дом бясплатна на той час, калі бібліятэка не працуе (выхадны або святочны дзень).

Пажылыя людзі з задавальненнем зноў і зноў прыходзяць у бібліятэку.

Штогод для ветэранаў бібліятэчнай сістэмы ў Дзень пажылых людзей ладзяцца вечары-сустрэчы (“Не старэюць душой ветэраны!” і інш.)

Бібліятэкары абслугоўваюць кнігай амаль 100 чытачоў **з абмежаваннямі па здароўі**, якім штогод выдаюць амаль 2 500 экз. дакументаў.

Бібліятэка-філіял № 3 актыўна супрацоўнічае з аддзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў ДУ “Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна”. У выніку штогод сумесна ладзяцца розныя інфармацыйна-масавыя мерапрыемствы. Так, для людзей з абмежаваннямі па здароўі ў межах цыкла мерапрыемстваў “Будзем разам” былі праведзены:

- “Твой сябар часопіс” (агляд перыядычных выданняў);
- “Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны” (гадзіна гісторыі);
- “Знакамітыя людзі Гродна” (літаратурна-гістарычная гадзіна).

Пастаянна ў бібліятэцы для наведвальнікаў з абмежаваннямі па здароўі ладзяцца шматлікія майстар-класы па вырабе розных рэчаў.

Наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў ДУ “Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна” ў мінулым годзе далучыліся да святкавання Дня бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Яны былі запрошаны на святочнае мерапрыемства “Кожнаму чалавеку шлях адкрыты ў бібліятэку”. Для маладых дюдзей была створана цёплая, сардэчная атмасфера. Бібліятэкары правялі экскурсію і расказалі пра магчымасці бібліятэкі. Потым ім была прапанавана мультымедыйная прэзентацыя пра бібліятэку і кнігу і салодкія пачастункі з гарбатай.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МАСАВАЯ РАБОТА

Для таго, каб прыцягнуць увагу да чытання, здзівіць чытачоў, зарадзіць іх бадзёрым і вясёлым настроем у бібліятэцы праходзіць вялікая колькасць **забаўляльных і пазнавальных мерапрыемстваў**.

Звычайна мерапрыемствы ўключаюць некалькі форм масавай работы: кніжную выставу, агляд літаратуры, конкурсна-гульнёвую праграму і інш. Для іх арганізацыі і правядзення актыўна выкарыстоўваюцца сучасныя мультымедыйныя сродкі: электронныя прэзентацыі, відэафільмы.

Наведвальнікі бібліятэкі з задавальненнем прымаюць удзел у інфармацыйна-масавых мерапрыемствах дзеля таго, каб пачуць нешта новае і цікавае, з карысцю правесці свой вольны час.

Самыя актыўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў – дзеці. Улічваючы іх імкненні да самавыражэння, бібліятэкары ўключаюць у праграму мерапрыемстваў віктарыны і конкурсы, гульні, выкананне песень і танцаў, майстар-класы і г.д.

## ЛІТАРАТУРНЫЯ ВАНДРОЎКІ

Бібліятэкары філіяла № 3 імкнуцца да таго, каб карыстальнікі любілі і чыталі кнігі. З гэтай мэтай некалькі гадоў запар яны праводзяць шэраг мерапрыемстваў, аб'яднаных агульнай назвай **"Літаратурныя вандроўкі"**.

У мінулым годзе ў Дзень славянскай пісьменнасці для вучняў 3 "В" класа ДУА "Гімназія № 3" прайшла гадзіна цікавай інфармацыі "Чалавек прыдумаў кнігу". Дзеці даведаліся на чым раней пісалі кнігі, хто вынайшаў друкавальны станок і кім была надрукавана першая кніга. Таксама пачулі якія бываюць кнігі па форме і памерах і пра тое, якія цяжкасці перажывае кніга ў век інфармацыйных тэхналогій.

А ў верасні ў Дзень бібліятэк для вучняў 4 "А" класа ДУА "Сярэдняя школа № 20" прайшло літаратурнае падарожжа "Мост ведаў у свет мары". Бібліятэкары расказалі дзецям пра незвычайныя кнігі, якія існуюць у свеце. Хлопчыкі і дзяўчынкі даведаліся, што самай старажытнай кнігай на Зямлі лічыцца папірус Прыса, а самай цяжкай – геаграфічны атлас, які важыць 320 кг. і захоўваецца ў Брытанскім музеі ў Лондане. Таксама дзеці пачулі захапляльныя гісторыі пра знакамітыя кнігі свету. Напрыканцы вандроўкі школьнікі паабяцалі, што ў хуткім часе зноў наведаюць бібліятэку.

Цікава прайшло літаратурнае падарожжа "Па цудоўнай краіне кніжных герояў" для малодшах школьнікаў ДУА "Сярэдняя школа № 20". Падчас мерапрыемства дзеці актыўна адказвалі на пытанні віктарыны па знакамітых казках, адгадвалі хто з кніжных герояў даслаў ім тэлеграмы і атрымалі салодкія прызы. Потым яны паслухалі агляд кніжных навінак і пазнаёміліся з бібліятэчнымі выставамі, пачыталі маляўнічыя часопісы і змястоўныя кнігі.

У бягучым годзе бібліятэка-філіял № 3 прыняла ўдзел у абласной акцыі "Чытаем разам!" з мэтай папулярызацыі кніг беларускіх аўтараў. Тут адбылося гучнае чытанне твораў Кандрата Крапівы. Для вучняў ДУА

“Гімназія № 3” байкі “Мурашка і жук”, “Плывец-тэарэтык”, “Пастрыжаны вожык” прачытаў гродзенскі паэт, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Радзівончык. Напрыканцы сустрэчы дзеці паглядзелі мультфільм па байцы К. Крапівы “Дыпламаваны баран”.

У бібліятэцы пастаянна дзейнічае кніжная выстава “Пісьменнікі-юбіляры”, якая сістэматычна абнаўляецца і змяшчае біяграфічныя звесткі, цікавыя факты пра жыццё, творчую дзейнасць беларускіх пісьменнікаў і паэтаў і іх творы.

## КАНІКУЛЫ З КНІГАЙ

Падчас школьных канікул бібліятэкары прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі вольнага часу і чытання дзяцей.

**Тыдзень дзіцячай кнігі** – самае любімае свята зацікаўленых дзяцей, улюбёных у кнігу, свята літаратурных прыгод, новых кніжных адкрыццяў, сустрэч з цікавымі людзьмі. Падчас вясновых канікул у межах Тыдня ў бібліятэцы праходзіць шмат пазнавальных мерапрыемстваў для дзяцей рознага ўзросту.

Цікавым і змястоўным было свята кнігі “Вясна. Канікулы. Кніга”, на якое дружна прыйшлі ў бібліятэку вучні ДУА “Гімназія № 3”. Дзеці даведаліся пра гісторыю ўзнікнення свята, пазнаёміліся з кнігамі-юбілярамі, адказалі на пытанні віктарыны па творчасці В. Драгунскага, М. Носава і інш. Не абышлося і без вясёлых гульняў, падарункаў і пачастункаў. Вельмі спадабалася дзецям гульня “Першавынаходнікі”, у якой пары ўдзельнікаў надзімалі шары, потым на іх малявалі смешныя тварыкі, а гледачы вызначалі пераможцаў.

А для вучняў ДУА “Сярэдняя школа № 20” прайшла літаратурная гульня-віктарына “З Алісай па краіне цудаў” па кнізе Л. Кэрала. Спачатку бібліятэкары расказалі дзецям гісторыю напісання казкі, пазнаёмілі іх з біяграфіяй і творчасцю аўтара, прадэманстравалі ілюстрацыі да вядомага твору, потым правялі віктарыну. Вучням было цікава даведацца ў якую ж гульню гуляла Аліса з Каралевай, што для іх служыла шарамі і хто з персанажаў валодаў дзіўнай усмешкай, якая жыла сама па сабе.

У бягучым годзе шумна, весела і нефармальна пачаўся Тыдзень дзіцячай кнігі святам нацыянальных культур “Мы ў міры, дружбе будзем жыць”. Першакласнікі з ДУА “Гімназія № 3” разам з педагогамі асвоілі нацыянальныя гульні, песні і нават танцы народаў свету, што пражываюць

у нашай краіне. Асаблівую ўвагу выклікала выстава лялек у нацыянальных касцюмах розных народаў і філатэлістычная выстава з уласнай калекцыі гродзенца, тэлеаператара ТРК “Гродна+” С. Печарыцы. Таксама да мерапрыемства з фондаў гарадскіх бібліятэк была арганізавана кніжная выстава дзіцячай літаратуры на мовах народаў свету “Шматнацыянальная markdown розначаляровасць”.

А падчас завочнага “Падарожжа па зямным шары” ў межах Тыдня дзіцячай кнігі дзеці з прышкольнага лагера ДУА “Сярэдняя школа № 20” даведаліся пра традыцыі і абрады розных народаў свету, адказалі на пытанні віктарыны і паглядзелі мультфільмы.

• • •

**Летнія канікулы** – самая плённая пара для арганізацыі эфектыўнай масавай работы з прыцягненнем летніх прышкольных пляцовак, у паркавых зонах і дзіцячых аздараўленчых лагерах.

Бібліятэкары рыхтуюць комплекс мерапрыемстваў, мэта якіх – арганізацыя вольнага часу дзяцей і бацькоў у перыяд летніх канікул, прыцягненне іх да чытання, развіццё інтэлекту дзяцей праз гульню і кнігу. У апошні час для юных чытачоў і іх бацькоў былі распрацаваны і аформлены выставы лепшай дзіцячай літаратуры (“Мы і кніга на канікулах”, “Сонца на кніжнай старонцы” і інш.), прапанаваны шматлікія масавыя мерапрыемствы, падчас якіх чытачы знаёміліся з новымі імёнамі ў літаратуры, гісторыяй роднага горада і краіны, таямніцамі цудоўнага свету прыроды і г.д.

Так, дзецям з прышкольнага лагера ДУА “Сярэдняя школа № 20” у мінулым годзе падчас канікул давялося здзейсніць літаратурнае падарожжа “Ад казачнага панядзелка да паэтычнай пятніцы”. Кожны дзень яны прымалі ўдзел у літаратурных віктарынах і конкурсах:

- панядзелак быў “Казачным”;
- аўторак – “Мультыплікацыйным”;
- серада – “Андэрсанаўскай”;
- чарвер быў прысвечаны кнізе Л. Кэрала “Аліса ў краіне цудаў”;
- пятніца была “Паэтычнай”.

Падчас падвядзення вынікаў літаратурнага тыдня пераможцы атрымалі прызы і салодкія пачастункі.

Яркай падзеяй для чытачоў было адкрыццё летняга бібліятэчнага дворыка “Парасон ад Оле Лукойе”. У пачатку чэрвеня каля бібліятэкі ў

акружэнні хлопчыкаў і дзяўчынак можна было сустрэць незвычайную даму – Мэры Попінс. Да ўвагі дзяцей яна прапанавала гульнёвую праграму “Парасон Оле Лукойе” і літаратурнае падарожжа па казках Андэрсана. Мэры Попінс пры дапамозе чорнага і каляровага парасонаў, расказвала дзецям гісторыю жыцця вялікага дацкага казачніка, а яны актыўна адказвалі на пытанні віктарыны па творах аўтара і атрымлівалі цудоўныя падарункі. Напрыканцы мерапрыемства адбыўся майстар-клас па вырабе парасонаў ад Оле Лукойе. Падчас працы адмысловага “бібліятэчнага дворыка” дзеці пазнаёміліся з лепшымі кнігамі айчынных і замежных аўтараў, чыталі маляўнічыя і змястоўныя часопісы, малявалі любімых літаратурных герояў, прынялі ўдзел у шматлікіх конкурсах.

Запамінальнай для чытачоў стала “Вялікая прагулка ў свет прывідаў”, якую здзейснілі наведвальнікі прышкольнага лагера ДУА “Сярэдняя школа № 20”. Падчас віртуальнага падарожжа дзецям давялося прайсці па замках, палацах і музеях нашай краіны. Што можа быць цікавей для аматараў таямніц гісторыі? Зразумела – старажытныя замкі, іх гісторыя, таямнічыя пакоі і невядомыя падземныя хады! А яшчэ…прывіды і легенды пра іх! Пра ўсё гэта і расказалі дзецям бібліятэкары. А яшчэ зрабілі агляд літаратуры гістарычнай тэматыкі, якую змяшчала кніжная выстава “Старонкі гісторыі края”, арганізаваная да мерапрыемства.

У бягучым годзе ў бібліятэцы № 3 таксама прайшло шмат мерапрыемстваў для дзяцей , якія наведваюць прышкольныя лагеры ДУА “Гімназія № 3” і ДУА “Сярэдня школа № 20”. Цікавым было падарожжа па казках Л. Кэрала “Чаяванне з Алісай”, якое ўключала гучныя чытанні, віктарыны і прагляды фільмаў пра Алісу. Адбыліся мерапрыемствы экалагічнай тэматыкі (віктарына “Жывёлы роднага краю”) і мерапрыемствы, накіраваныя на развіццё інтэлекту (віктарына “Эрудыт”). Разам з бібліятэкарамі дзеці пабывалі ў Горадзе майстроў, дзе даведаліся пра прафесіі сталяра, ганчара, пляцельшчыка і інш. Ладзіліся шматлікія майстар-класы, дзе дзеці майстравалі вырабы з розных матэрыялаў і ўвогуле весела бавілі час.

• • •

**Асеннія канікулы** – час творчасці ў бібліятэцы. Разам з бібліятэкарамі дзеці збіраюць каштаны, жалуды, шышкі і рознакаляровае лісце, займаюцца аплікацыяй і маляваннем, майструюць прыгожыя і незвычайныя вырабы. Бібліятэкары ўпэўнены, што такія заняткі

дапамагаюць развіваць многія карысныя якасці: творчае мысленне, увагу, логіку, працавітасць і інш.

Акрамя таго бібліятэкары заўсёды прапаноўваюць дзецям і падлеткам цікавую літаратуру, якую можна пачытаць у вольны ад школьных заняткаў час і шэраг інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў рознабаковай накіраванасці, што ладзяцца ў сценах бібліятэкі.

• • •

Усе дзеці з нецярпеннем чакаюць самае таямнічае і чароўнае свята – Новы год – гэта казка, у якой вельмі хочацца апынуцца. Таму бібліятэкары прыкладаюць усе намаганні, каб зрабіць **зімовыя канікулы** вясёлымі, задорнымі, чароўнымі і незабываемымі. Для дзяцей ладзяцца святы, вечарыны і літаратурна-музычныя ранішнікі, падчас якіх можна даведацца, пра тое, як сустракаюць Новы год у розных краінах свету, пра калядныя традыцыі, беларускія народныя зімовыя забавы і інш. Заўсёды дзеці чытаюць вершы, спяваюць навагоднія песні, глядзяць мультфільмы і, вядома, атрымліваюць падарункі ад Дзеда Мароза. Для наведвальнікаў бібліятэкі ў гэты час арганізаваны маляўнічыя выставы, што змяшчаюць цудоўныя выданні пра зіму, Каляды і Новы год.

## БІБЛІЯСАД

“Неаднаразова мне даводзілася чуць, што сённяшнія дзеці пачалі менш чытаць, але я не даю гэтаму веры. Лічу, што такія чуткі прыдумалі дарослыя, вельмі стомленыя ад сваіх спраў, якія не маюць часу адкрыць кнігу і пасядзець разам са сваім дзіцём. А чытанне кніг з блізкімі людзьмі – гэта ж такі цудоўны занятак,” – ***гаворыць І.В. Сотнікава.***

На працягу апошніх гадоў бібліятэка актыўна працуе ў межах **праграмы “Бібліясад”**. Бібліятэкары штомесяц наведваюць выхаванцаў ДУА “Яслі-сад № 46”. Дзецям яны прапануюць гучныя чытанні з абмеркаваннем лепшых мастацкіх твораў. Пасля гэтага малышы з задавальненнем выконваюць вясёлыя заданні: адказваюць на пытанні віктарын, малююць і лепяць з пластыліну герояў прачытаных твораў.

“Чытанне ўслых – гэта, ў першую чаргу, радасць. Ад любімай кнігі, ад фразы, ад стылю твора, ад магчымасці падзяліцца задавальненнем ад прачытанага з іншымі, падарыць сябе, сваё прачытанне, сваё ўспрыняцце, сваё захапленне кнігай,” – ***дзеляцца меркаваннямі супрацоўнікі бібліятэкі***.

Самым запамінальным для дзяцей стала свята непаслухмянасці “Пыхтелки, сопелки, ворчалки” па творах дзіцячых паэтаў Б. Захадэра, С. Міхалкова, Г. Остэра.

Таксама цікава прайшлі гучныя чытанні “А ў казкі ціхі галасок”. Выхаванцам розных узроставых груп бібліятэкары чыталі казкі, а малышы з задавальненнем слухалі іх. А якую казку пачытаць – дзеці выбіралі самі. Асабліва ім падабалася слухаць творы пра жывёл і потым расказваць пра сваіх дамашніх гадаванцаў.

А вось падчас наведвання дзіцячага сада з праграмай “Мышкі і кніжкі” дашкаляты мелі магчымасць не толькі паслухаць казку ў выкананні бібліятэкара, але і паглядзець любімыя мультфільмы пра мышак.

Для выхавальнікаў бібліятэкары заўсёды праводзяць агляды літаратуры педагагічнай і псіхалагічнай тэматыкі, лепшых мастацкіх дзіцячых твораў; для бацькоў – пакідаюць рэкамендацыйныя спісы літаратуры, рэкламныя буклеты пра дзейнасць бібліятэкі і запрашэнні да наведвання ўстановы і сумеснага чытання.

## АБУДЖЭННЕ ДА ДУХОЎНАГА ЖЫЦЦЯ

Значную ўвагу ўдзяляюць бібліятэкары **духоўна-маральнаму выхаванню** дзяцей і падлеткаў: выхаванню дабрыні, паважлівых адносін да людзей, асабліва да старэйшага пакалення. Таму супрацоўнікі бібліятэкі прыкладаюць усе намаганні, каб праз кнігу і чытанне выхаваць у дзяцей міласэрнасць, спачуванне, цярплівыя адносіны да акружаючых.

“Каб радасць людзям дарыць, трэба добрым і ветлівым быць” – пад такой назвай прайшла газіна дабрыні для вучняў 3-х класаў ДУА “Гімназія № 3” у мінулым годзе. Дзеці вучыліся правілам паводзін у сучасным грамадстве, адказвалі на пытанні віктарыны і выказвалі свае думкі пра тое, як трэба сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі. Разам з бібліятэкарам яны абмяркоўвалі складаныя моманты школьнага жыцця, цяжкасці зносін з сябрамі і бацькамі і імкнуліся дапамагчы адзін аднаму парадамі.

Падчас гутаркі “Вучымся быць ветлівымі” дзеці даведаліся як трэба знаёміцца, вітаць адзін аднаго, як звяртацца да старэйшых і г.д. Яны падзяліліся сваімі ведамі пра тое, як трэба паводзіць сябе ў класе, з сябрамі, на вуліцы, у грамадскім транспарце. Гаворка ішла нават пра братоў нашых меншых, пра тое, што трэба дапамагаць бяздомным і

безабаронным жывёлам. Дзеці ўсвядомілі, што да ўсіх трэба праяўляць павагу, любоў і міласэрнасць.

У пачатку бягучага года бібліятэкары філіяла № 3 прынялі ўдзел у акцыі “Падары цеплыню і любоў праз абдымкі!” у падтрымку падапечных Гродзенскага дзіцячага хоспіса, якая была арганізавана па ініцыятыве валанцёраў хоспіса і прымеркавана да Міжнароднага дня абдымкаў. На працягу працоўнага дня бібліятэкары не проста абдымалі чытачоў, але і раздавалі інфармацыйныя лістоўкі пра дзейнасць дзіцячага хоспіса. Спецыяльна ў гэты дзень у бібліятэцы адбылося свята “Ад абдымкаў да дружбы”. Дзеці 3 “В” класа ДУА “Гімназія № 3” прымалі актыўны ўдзел у гульнях і конкурсах: абдымалі адзін аднаго як “слонікі”, малявалі вясёлыя тварыкі на шарах, хлопчыкі гулялі ў армрэслінг. Пры гэтым не забывалі проста абдымацца і…лавіць мыльныя бурбалкі. Дзеці атрымалі падарункі, станоўчы зарад эмоцый і выдатна правялі час. І галоўнае – усвядомілі для сябе важнасць сяброўства.

Да мерапрыемстваў па выхаванні духоўнасці і міласэрнасці заўсёды афармляліся кніжныя выставы:

- “Навучы сваё сэрца дабрыні”;
- “Няхай добрым будзе свет вакол мяне!”;
- “Хрысціянскія каштоўнасці ў сучаснай беларускай культуры”.

## ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЁТА І ГРАМАДЗЯНІНА

На працягу многіх гадоў адным з прыярытэтных напрамкаў у рабоце бібліятэкі з’яўляецца **выхаванне патрыятызму** і любові да роднага краю. З гэтай мэтай супрацоўнікі правялі шэраг мерапрыемстваў па вывучэнні гісторыі роднага краю.

Значным з’яўляецца ўдзел у Міжнароднай акцыі “Чытаем дзецям пра вайну” – мэта якой напомніць дзецям і падлеткам пра мужнасць і гераізм воінаў, якія аддалі сваё жыццё за Перамогу.

Штогод у бібліятэцы ладзіцца шэраг мерапрыемстваў да Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне:

- “Дзякуем за Перамогу” (гадзіна памяці);
- “Дзяцінства, абпаленае вайной” (урок гісторыі);
- “Калі палаў мой край у полымі вайны” (урок мужнасці);
- “Песні вялікага подзвігу” (музычна-паэтычны прывал) і інш.

Шмат цікавага даведаліся старэйшыя школьнікі ДУА “Сярэдняя школа № 20” пра службу ў арміі падчас ваенна-патрыятычнай гульні “Гонар. Годнасць. Гераізм”. А на ўроку мужнасці “Піянеры-героі Беларусі” дзеці з інтарэсам слухалі пра сваіх аднагодкаў, якія змагаліся супраць ворагаў поруч з дарослымі.

Падчас гадзіны памяці “Прайшла праз дзяцінства вайна” сучасныя школьнікі даведаліся пра тое, які адбітак вайна аставіла на дзіцячых лёсах, што ім давялося перажыць у той нялёгкі час. Аб юных героях-сусанінцах, “сынах палкоў”, дзецях-вязнях канцлагераў, піянерах-героях расказалі прысутным бібліятэкары. Закончылася мерапрыемства знаёмствам з літаратурнымі творамі пра ваеннае дзяцінства і праглядам буктрэйлера “Дзеці вайны”.

Запомнілася дзецям сустрэча “Служыць народу і дзяржаве”, якая адбылася напарэдадні Дня абаронцаў Айчыны Рэспублікі Беларусь у мінулым годзе. У бібліятэку на сустрэчу з вучнямі прыйшоў ветэран Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, падпалкоўнік у адстаўцы В.Ф. Гілеў. Ён аказаўся не толькі добрым апавядальнікам і знаўцам гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, але і выканаўцам песень ваеннай пары.

Падчас мерапрыемстваў заўсёды ладзяцца прагляды кніжна-ілюстраваных выстаў:

- “Рэха далёкай вайны”;
- “Дарогамі вайны і Перамогі”;
- “Помнім боль і страты твае, Беларусь!”.

• • •

У сучасны час **прававое выхаванне** стала важным накірункам у рабоце бібліятэкі з падрастаючым пакаленнем, таму што, ведаючы свае ўласныя правы, дзеці вучацца паважаць правы іншых людзей не парушаючы іх.

Пры дапамозе бібліятэкараў падчас гадзін інфармацыі (“Сям’я і права”, “Закон, па якім мы жывем”, “Правапарушэнне. Злачынства. Падлетак”), інфармін (“Я ў гэтым вялікім свеце”, “У прававым лабірынце”, “Павінен ведаць кожны”), урокаў прававых ведаў (“Твае правы, падлетак!”, “З законам па жыцці”, “Мы ўсе розныя, але правы ў нас аднолькавыя”) дзеці, падлеткі і моладзь знаёміліся са сваімі правамі і абавязкамі, з асноўнымі законамі, што дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, з мерамі адказнасці за правапарушэнні і інш.

У бібліятэцы таксама былі арганізаваны выставы:

- “Прававаая планета”;
- “Падлетак. Закон. Права”;
- “Жыць у згодзе з законам”.

## ГРОДНА – МОЙ ГОРАД

**Краязнаўчая дзейнасць** з’яўляецца адным з асноўных напрамкаў работы бібліятэкі, якая ўключае: арганізацыю краязнаўчага фонду дакументаў, правядзенне сустрэч са знакамітымі людзьмі, знаёмства з творчасцю мясцовых пісьменнікаў і паэтаў, народных майстроў горада.

З вялікай цікавасцю дзеці і падлеткі здзяйснялі віртуальныя экскурсіі па знакамітых мясцінах горада, падчас якіх знаёміліся са славутасцямі г. Гродна.

Сярод моладзевай аўдыторыі запатрабаваны ўрокі краязнаўства, гадзіны мужнасці, літаратурна-гістарычныя вечары і дыспуты.

Найбольш цікавыя мерапрыемствы краязнаўчай тэматыкі, што адбыліся ў бібліятэцы:

- “Наш герб і сцяг – гэта сімволіка свабоды” (падарожжа ў краіну сімвалаў Беларусі);
- “Прыйшоў з мінулага, каб увайсці ў будучыню” (гадзіна гісторыі, прысвечаная дзейнасці Ф. Скарыны);
- “Пра парк Жылібера і заапарк Каханоўскага” (агляд кніг гродзенскага краязнаўцы В. Саяпіна);
- “Родны край – сэрцу рай” (гульня-віктарына).

Карыснай і цікавай была пазнавальная гадзіна “Іх імёны – у гісторыі Гродна”. Дзеці даведаліся пра людзей, якія зрабілі значны ўклад у гісторыю горада. Гэта стваральнік міжнароднай мовы эсперанта Людвік Заменгоф, вядомы тэатральны мастак Леў Бакст, асілак Якуб Чэхаўскі, гродзенскі стараста і рэфарматар Антоній Тызенгаўз, князі Вітаўт Вялікі і Давід Гарадзенскі. Пасля мерапрыемства ўсе дружна выбіралі гістарычныя кнігі і гарталі часопісы.

Вельмі цікава прайшла экскурсія па г. Гродна на рэтра-тралейбусе для вучняў 5 “Б” класа ДУА “Сярэдняя школа № 20”, падчас якой дзеці пазнаёміліся з гістарычнымі мясцінамі горада, яго архітэктурнымі помнікамі, набылі сувеніры на памяць аб паездцы і проста весела правялі вольны час.

Шырока адзначаюць у бібліятэцы такія народныя святы як: Нараджэнне Хрыстова, Масленіца, Вялікдзень, падчас якіх удзельнікі мерапрыемстваў знаёмяцца з беларускімі народнымі традыцыямі і абрадамі, дзеці з задавальненнем гуляюць у народныя гульні, чытаюць і слухаюць беларускія казкі, легенды і паданні.

У мінулым годзе бібліятэкары разам са школьнікамі 2-х і 3-х класаў ДУА "Гімназія № 3" святкавалі Масленіцу ў адпаведнасці з народнымі традыцыямі – з провадамі зімы, са смехам, песнямі, з гуканнем вясны і блінамі. "Масленіца" са світай скамарохаў весяліла дзяцей. Яны гулялі ў снежкі, перацягвалі канат, спаборнічалі ў "пеўневых баях", бегалі напераганкі ў мяхах і адгадвалі загадкі. Вясёлае свята закончылася карагодамі і провадамі Масленіцы.

У апошні час для наведвальнікаў бібліятэкі былі аформлены кніжныя выставы краязнаўчай тэматыкі:

- "Гісторыяй дыхае кожная старонка";
- "Гродзеншчына шматнацыянальная";
- "Гродна праз палітру культурных падзей";
- "Паэтычнае суквецце Гародні";
- "Беларусь – дзяржава для народа".

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МАЗАІКА

У бягучым годзе бібліятэка-філіял № 3 у межах цыкла мерапрыемстваў "Нацыянальная мазаіка" распачала **супрацоўніцтва з гродзенскім аддзяленнем казахскага аб'яднання МГА "Ата-мекен"**. У канцы мая адбылася першая сустрэча бібліятэкараў і членаў аб'яднання. Мерапрыемства было прысвечана 170-годдзю з дня нараджэння знакамітага казахскага паэта-акына Джамбулы Джамбаева. Госці пазнаёміліся з біяграфіяй паэта, паслухалі яго вершы і паглядзелі кінафільм. Напрыканцы мерапрыемства старшыня аб'яднання – Мусліма Мукатаўна Мейсак пачаставала ўсіх прысутных нацыянальнай выпечкай баурсакі.

Бібліятэкары плануюць далейшае плённае супрацоўніцтва з аб'яднаннем "Ата-Мекен", спадзяюцца, што такія сустрэчы ў бібліятэцы будуць пастаяннымі.

## БІБЛІЯТЭКА – ТЭРЫТОРЫЯ ЗДАРОЎЯ

**Выхаванне здаровага ладу жыцця** – адзін з важных напрамкаў дзейнасці бібліятэкі ў межах цыкла мерапрыемстваў "Бібліятэка – тэрыторыя здароўя". Бібліятэкары выкарыстоўваюць формы работы прафілактычнага характару, накіраваныя супраць распаўсюджвання шкодных звычак сярод падлеткаў і моладзі. Падчас мерапрыемстваў удзельнікі атрымліваюць інфармацыю пра фізічныя практыкаванні, карысныя для здароўя стравы і напоі, лекавыя расліны, рэцэпты народнай медыцыны, вучацца аказваць першую медыцынскую дапамогу і інш.

На прафілактыку СНІДу былі накіраваны наступныя мерапрыемствы:

- "Рэквіем памяці памерлых ад СНІДу" (дзень памяці);
- "Білет у адзін канец" (урок-роздум);
- "СНІД – ведаць і змагацца" (гадзіна інфармацыі).

З мэтай папярэджвання шкодных звычак у бібліятэцы былі праведзены мерапрыемствы:

- "Я не буду заложнікам шкодных звычак" (дзень здароўя);
- "Наступствы ўжывання алкагольных напояў" (гадзіна інфармацыі);
- "Шкодным звычкам – НЕ!" (гадзіна інфармацыі);
- "У здаровым целе – здаровы дух" (інфарміна);
- "Хочаш быць здаровым – будзь!" (інфарміна).

Частымі гасцямі мерапрыемстваў па выхаванні здаровага ладу жыцця з'яўляюцца медыцынскія супрацоўнікі ДУ "Гродзенскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі".

## ЗЯЛЁНАЯ ПЛАНЕТА

Мерапрыемствы **экалагічнай тэматыкі** накіраваны на вахаванне ў чытачоў беражлівых адносін да акаляючага свету дзеля таго, каб выклікаць у іх інтарэс да праблем экалогіі. З гэтай мэтай бібліятэкары выкарыстоўваюць самыя розныя формы і метады работы: афармляюць кніжныя выставы, арганізуюць сустрэчы са спецыялістамі, ладзяць экалагічныя святы, гадзіны карыснай інфармацыі, пазнавальныя гульні і конкурсы.

Так, у бібліятэцы ў рамках цыкла “Зялёная планета”, што на працягу некалькіх гадоў дзейнічае ў ЦБС ладзіцца шэраг мерапрыемстваў:

- “Мы – прыроды нашай сябры” (экалагічная гадзіна);
- “Прыроды мудрыя парады” (гадзіна інфармацыі);
- “Таямніцы жывой прыроды” (гадзіна карыснай інфармацыі);
- “Мы за іх у адказе” (урок дабрыні);
- “Па старонках кніг у краіну прыроды” (агляд літаратуры)і інш.

Падчас займальнага і пазнавальнага завочнага падарожжа “Па старонках Чырвонай кнігі” дзеці адправіліся ў лес, каб выратаваць знікаючыя віды раслін. На іх шляху было шмат небяспечных сітуацый, але дзякуючы сваім ведам, дзеці дастойна з імі справіліся.

На мерапрыемствах бібліятэкары не толькі ўздымаюць экалагічныя праблемы і абмяркоўваць шляхі іх вырашэння. Яшчэ там можна пачуць вершы і ўрыўкі з твораў, прысвечаныя прыгажосці роднай прыроды, паслухаць музычныя кампазіцыі і паглядзець фільмы пра раслінны і жывёльны свет.

Змястоўныя і прывабна афармленыя кніжныя выставы экалагічнай тэматыкі заклікаюць зберагаць і любіць прыроду:

- “Гартаючы кнігу прыроды”;
- “Праз кнігу – любоў да прыроды”;
- “Праблемы экалогіі ў беларускай літаратуры” і г.д.

## КЛУБЫ ПА ІНТАРЭСАХ

Бібліятэка – месца для правядзення вольнага часу і цёплых зносін наведвальнікаў. Прыходзяць людзі сюды для таго, каб адпачыць, раздзяліць свае інтарэсы з сябрамі і блізкімі, атрымаць магчымасць самавыражэння і творчай дзейнасці.

Пры бібліятэцы-філіяле № 3 дзейнічаюць **3 клубы па інтарэсах** для наведвальнікаў розных узроставых груп.

У **клубе “Гарадзенская лялька”** (кіраўнік – Сотнікава І.В.) збіраюцца жанчыны (больш за 30 чалавек), якія займаюцца вырабамі з розных матэрыялаў (гліна, пластыка і інш.).

Клуб быў створаны ў 2014 годзе. Першапачаткова майстар-класы па вырабе лялек праходзілі пад кіраўніцтвам вядомай гродзенскай рамесленніцы Галіны Жамчужнікавай. Спачатку ўдзельніцы клуба

навучыліся рабіць традыцыйную народную ляльку. Кожная такая рэч выраблена без адзінага шва, мае свой сэнс і прызначэнне. Напрыклад, лялька Кувадка сустракае дзіця, як толькі яно з’явіцца на свет. Падвешваюць гэтых лялек ля калыскі як бразготкі. У даўніну лічылі, што гэтыя лялькі будуць аберагаць дзіця. Таксама на занятках у клубе стварылі Скарбонку-траўніцу (лялька-абярэг жылля) і Кармілку вепскую (лялька-абярэг сям’і).

Потым удзельніцы клуба вырашылі зрабіць лялькі літаратурных герояў – Карлсана, Чырвоную Шапачку, Алісу з краіны цудаў – і ўпрыгожыць імі “казачны куток” бібліятэкі.

Акрамя таго, у клубе вычуліся пляценню, рабілі ўпрыгожванні з прыродных матэрыялаў. Свае майстар-класы прапанавалі ўдзельніцам гродзенскія ўмеліцы С. Касенка, Ж. Біленка, І. Булаева, С. Янчылік і іншыя майстрыхі.

Сярод творчых работ удзельніц клуба неабходна адзначыць выраб лялек, што адлюстроўваюць герояў з беларускіх твораў. Менавіта такімі вырабамі суправаджаюцца кніжныя выставы, якія афармляюцца ў бібліятэцы (“Нашэсце мядзведзяў у бібліятэку” – выстава мішак і кніжак пра мядзведзяў” і інш.).

Ладзяць удзельніцы клуба “Гарадзенская лялька” выставы сваіх работ і па-за сценамі бібліятэкі. У 2015 годзе у Дзень беларускага пісьменства была арганізавана выязная выстава-экспазіцыя “Кнігі і лялькі” ў г. Шчучын, а пазней у Музеі гісторыі Гарадніцы на выставе “Традыцыі навагодніх святаў. Новы год і Нараджэнне Хрыстова” яны прадставілі сваю экспазіцыю “Калядная батлейка”.

У бягучым годзе ў Музеі гісторы Гарадніцы ўрачыста адкрылася выстава лялек “Чаяванне ў Алісы”. Геніяльная казка Льюіса Кэрала натхніла ўдзельніц клуба “Гарадзенская лялька” на стварэнне вобразаў герояў цудоўнай кнігі – Алісы, Шляпніка, Шалтая-Балтая і іншых вядомых персанажаў. А работы гродзенскага мастака Ягора Шакаладава арганічна дапоўнілі задумку аўтараў выстаўкі.

На адным з пасяджэнняў клуба майстар-клас па тэхніцы дэкупажу правяла народная ўмеліца І. Вараб’ёва. Удзельніцы клуба вучыліся афармляць бутэлькі і вырабы з дрэва. У выніку, напрыканцы заняткаў, з’явіліся незвычайна прыгожыя рэчы.

Часта ў клубе “Гарадзенская лялька” праходзяць майстар-класы пад кіраўніцтвам яшчэ адной гродзенскай умеліцы В.Ю. Генюш. Так, у бягучым годзе адбыліся заняткі па тэхніцы сухога валяння падчас якіх

члены клуба сумеснымі намаганнямі стварылі шары для калектыўных пацерак.

Таксама цікава прайшоў майстар-клас па скрапбукінгу ад мастацтвазнаўцы А. Матук. Напярэдадні Дня жанчын удзельніцы майстар-класа вучыліся сваімі рукамі рабіць прыгожыя віншавальныя паштоўкі з кветак, матылькоў, стразаў і звычайнай паперы. Атрымаліся абсалютна розныя работы, таму што працэс гэта дастаткова творчы, захапляльны і карпатлівы.

На адно з мерапрыемстваў клуба былі запрошаны малодшыя школьнікі ДУА "Гімназія № 3" і школьныя бібліятэкары – удзельнікі курсаў павышэння кваліфікацыі Гродзенскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. Для дзяцей была арганізавана кніжная выстава "Жывёлы – героі кніг", праведзены займальныя конкурсы і майстар-клас па вырабе катоў і мышэй з каштанаў і пластыліну. Дзеці з задавальненнем адказвалі на пытанні віктарыны пра жывёл, майстравалі цацкі і атрымалі салодкія пачастункі. Для сваіх калег, школьных бібліятэкараў, супрацоўнікі філіяла прапанавалі прэзентацыю "Народная лялька" і майстар-клас па вырабе лялькі-траўніцы. Таксама прадэманстравалі фільм пра дзейнасць клуба "Гарадзенская лялька". Прысутныя падзяліліся вопытам работы па абслугоўванні дзіцячага чытача і абмяняліся ўражаннямі.

Пасяджэнні ў клубе даюць жанчынам адчуванне задавальнення, узнёслага настрою і радасці. Штогод клуб "Гарадзенская лялька" папаўняецца новымі ўдзельніцамі.

У мінулым годзе на базе бібліятэкі № 3 ладзіліся заняткі школы-практыкума "Упэўнены бібліятэкар" на тэму "Загадкавы свет лялек". Да ўвагі калег было прапанавана "Арт-асарці", якое складалася з блокаў:

- "Гісторыя паходжання лялек і іх тыпалогія" (гістарычная экскурс);
- "Ад творчасці да кнігі" (выстава і бібліяграфічны агляд літаратуры пра выраб лялек у розных тэхніках);
- "Лялькі, якія выконваюць жаданні" (інфарм-дайджэст пра абрадавых лялек);
- "Персоны і персанажы" (аповед аб прататыпах кніжных герояў);
- прэзентацыя відэароліка пра дзейнасць клуба "Гарадзенская лялька".

Дапоўніла заняткі выступленне майстра па вырабе аўтарскай лялькі Г. Жамчужнікавай і члена клуба Р. Багдановіч, якая прачытала сваё

апавяданне “Лялька”. Кожны з прысутных атрымаў у падарунак лялькуабярэг.

Акрамя таго, Сотнікавай І.В. для удзельніц клуба і ўсіх зацікаўленых былі складзены тэматычныя спісы літаратуры (“Ад творчасці да кнігі: бібліяграфічны спіс літаратуры пра лялькі, цацкі і іх выраб” і інш.).

Адметнай рысай з’яўляецца дабрачынная дзейнасць удзельніц клуба “Гарадзенская лялька”. Так, у мінулым годзе двойчы яны ладзілі дабрачынную выставу-продаж уласных вырабаў (вазы, лялькі, букеты з цукерак, упрыгожванні з прыродных матэрыялаў). Атрыманыя сродкі былі напраўлены на ўтраманне жывёл у ГГА “Адданае сэрца”.

• • •

Дзейнасць дзіцячых клубаў бібліятэкі-філіяла № 3 накіравана на арганізацыю вольнага часу дзяцей па-за межамі школьных заняткаў, развіццё іх інтэлекту, мыслення і рэалізацыю творчага патэнцыялу.

Трэці год для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту дзейнічае **краязнаўчы клуб “Юны гарадзенец”** (кіраўнік – Сотнікава І.В.). Яго з задавальненнем наведваюць 24 хлопчыкі і дзяўчынкі. Асноўны напрамак работы клуба – краязнаўчая дзейнасць; мэта – патрыятычнае выхаванне, выхаванне любові да сваёй Радзімы, павагі да культурнай і гістарычнай спадчыны краю, фарміраванне грамадзянскай пазіцыі ў падрастаючага пакалення.

Заняткі ў клубе носяць рознапланавы характар, для ўдзельнікаў арганізуюцца экскурсіі, як віртуальныя, так і па знакамітых мясцінах Гродна, краязнаўчыя гадзіны, урокі гісторыі, гадзіны мужнасці і інш.

На пасяджэннях клуба дзеці маюць магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй роднага краю і горада, сустрэцца з цікавымі людзьмі. Запамінальнымі і змястоўнымі для дзяцей 6-х класаў ДУА “Сярэдняя школа № 37” сталі:

- “Знакамітыя людзі Гродна” (гадзіна гісторыі);
- “Калядныя пасядзелкі” (гадзіна інфармацыі);
- “Архітэктурныя шэдэўры Беларусі” (гістарычная гульня);
- “Я ў гэтым горадзе жыву, я гэты горад ведаю” (завочнае падарожжа) і інш.

У 2014 годзе “юныя гарадзенцы” пабывалі на экскурсіі ў Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царкве мэта якой – знаёмства з гісторыка-культурнай спадчынай Гродна.

Захапляльнай была экскурсія клуба ў “Музей гісторыі пажарнай службы”. Экскурсавод Качан І.І. цікава і змястоўна распавяла пра тое, як раней у горадзе тушылі пажары, паказала вяроўку, пры дапамозе якой ратавалі людзей. З гісторыяй станаўлення і развіцця пажарнай справы на Гродзеншчыне дзеці пазнаёміліся дзякуючы экспазіцыі з гравюрамі, дакументамі, фотаздымкамі, цэнтральнае месца ў якой займае дыярама, прысвечаная пажару 1885 года. У той час полымя знішчыла вялікую частку горада і для папярэджання пажараў была пабудавана Каланча. Апоўдні дзеці пачулі з яе гук трубы, які паведаміў жыхарам пра тое, што ў горадзе ўсё спакойна.

У наступны раз, дзякуючы вядомаму гісторыку, археолагу Алесю Краўцэвічу, удзельнікам клуба давялося акунуцца ў старажытныя часы. А. Краўцэвіч расказаў аб жыцці і занятках рыцараў 13-14 стагоддзяў. Дзяўчынкам спадабалася рыцарская вопратка – даспехі, а хлопчыкаў вельмі зацікавіў спосаб падачы сігналу трывогі – развядзенне вогнішча на верхавінах дрэў.

Экскурсія “Старадаўніх муроў адраджэнне: мінулае і сучаснасць Лідскага і Мірскага замкава-паркавага копмлексу” ўключала наведванне знакамітых гарадоў: Міра, Навагрудка і Нясвіжа. Удзельнікі клуба з задавальненнем падарожнічалі па гістарычных мясцінах Беларусі: пазнаёміліся з г. Навагрудкам – першай сталіцай ВКЛ, падняліся на гару, створаную у гонар  Адама Міцкевіча, прайшліся па музейных залах Мірскага замка і Нясвіжскага палаца-паркавага ансамбля. Добры настрой, вялікая колькасць фотаздымкаў і сувеніраў сведчаць пра тое, што экскурсія атрымалася цікавай і карыснай.

Таксама падлеткаў зацікавілі “Легенды і таямніцы гродзенскіх замкаў” – пад такой назвай адбылася экскурсія ў УК “Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей”. Там яны пазнаёміліся з экспазіцыяй пра гісторыю будаўніцтва каралеўскага палаца і выставамі зброі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш.

Давялося ўдзельнікам клуба наведаць выставу Нацыянальнага Шведскага Музея Ваеннай Гісторыі і Арміі “Рэчы паміж жыццём і смерцю”, якая выклікала сапраўдную цікавасць у хлопчыкаў і выставу “ART-панарама. Маладыя мастакі Беларусі”, з экспанатаў якой асабліва ўсім спадабаліся лялькі.

Удзельнікі клуба “Юны гарадзенец” у 2015 годзе здзейснілі захапляльнае падарожжа ў агратурыстычны комплекс “Каробчыцы”. Дзеці не толькі назіралі за жывёламі – паўнапраўнымі жыхарамі комплексу, але

і адказвалі на пытанні віктарыны пра флору і фаўну роднага краю. Дамоў яны вярнуліся прыемна ўражанымі і задаволенымі ад паездкі.

Таксама дзеці пабывалі на экскурсіі ў УК “Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі”. Там удзельнікі клуба з цікавасцю пазнаёміліся з экспанатамі выставы “Эпоха. Час. Будынак”, прымеркаванай да 30-годдзя з часу адкрыцця музея.

У бягучым годзе на першым пасяджэнні клуба “юныя гарадзенцы” разважалі пра тое, што такое Радзіма і малая Радзіма, адказвалі на пытанні віктарыны пра Беларусь, пазнаёміліся з гісторыяй заснавання Гродна і асноўнымі гістарычнымі падзеямі, якія адбываліся да Вялікай Айчыннай вайны ў родным горадзе.

Падчас наступнай сустрэчы дзеці пабывалі на экскурсіі ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі на выставе “Ад сініх кветак да кашуль дзетак”, прысвечанай традыцыям беларускага народнага ткацтва. Яны пазнаёміліся з гісторыяй ручнога ткацтва, працэсам вытворчасці і апрацоўкі ільну, вырабу ручнікоў, абрусаў, пакрывал, беларускага народнага касцюма.

Яшчэ на адным з пасяджэнняў дзеці даведаліся пра гісторыю ўзарванай Фары Вітаўта і пра Гродзенскую аптэку-музей.

Да мерапрыемтсваў, што адбываюцца на пасяджэннях клуба заўсёда афармляюцца кніжныя выставы, на якіх прадстаўлены выданні пра жывапіс, музыку, архітэктуру, народную творчасць Гродзеншчыны і інш.

• • •

Эстэтычным выхаваннем дзяцей і падлеткаў займаюцца ў **Акадэміі дзіцячай творчасці “Ліловы слімак”**, што дае дзецям, а гэта 25 школьнікаў, шэраг магчымасцяў для творчасці. На занятках арганізуюцца майстар-класы па вырабе рэчаў з гліны, пластыліну, паперы і розных прыродных матэрыялаў. Усе заняткі суправаджаюцца літаратурнымі гульнямі, конкурсамі, гучным чытаннем твораў. Так, у творчай атмасферы наведвальнікі Акадэміі яшчэ і прыцягваюцца да чытання.

Насычаным быў майстар-клас па вырабе савы з фетра і шышак, які адбыўся ў мінулым годзе. Удзельнікі Акадэміі не толькі працавалі, але і даведаліся аб тым, якія віды соў жывуць у Беларусі, як яны сябе паводзяць у жывой прыродзе. Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з кнігамі і часопісамі, у якіх расказваецца аб мудрай птушцы. Пасля гэтага для іх правялі віктарыну аб жывёлах і паказалі мультфільм “Урокі мудрай савы”.

Потым быў арганізаваны майстар-клас па вырабе пінгвінаў з пластыкавых бутэлек. Дзеці навучыліся рабіць сімпатычнага пінгвіна,

бібліятэкар пазнаёміла іх з кнігамі, якія змяшчаюць інфармацыю аб гэтых дзіўных птушках. Завершылася мерапрыемства праглядам дакументальнага фільма аб пінгвінах з мультфільма “Пінгвіны з Мадагаскара”.

У першы дзень вясновых канікул у мінулым годзе для дзяцей быў арганізаваны майстар-клас па вырабе традыцыйнай беларускай выцінанкі ад В.Ю. Генюш. А дзякуючы бібліятэкарам удзельнікі заняткаў даведаліся пра гісторыю ўзнікнення выцінанкі і яе прымяненне ў жыцці беларусаў.

Удзельнікам Акадэміі дзіцячай творчасці вельмі спадабалася ўпрыгожваць велікодныя яйкі пад кіраўніцтвам майстрыхі В.Ю. Генюш. Пенапластавае яйка спачатку пакрывалася акрылавай фарбай, затым лакам, а ўжо пасля дзеці наклейвалі папяровых матылькоў, куранят, кветачкі на свой густ.

Акрамя таго для ўдзельнікаў Акадэміі ладзіліся ўрокі лепкі з пластыліну і ўрокі малявання.

## РЭКЛАМНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Цікава, у арыгінальнай форме прадстаўлена інфармацыя рэкламнага характару пра бібліятэку і яе паслугі для карыстальнікаў:

- на Дошцы інфармацыі (у рубрыках “Шчыра запрашаем”, “Бібліятэка прапануе паслугі”, “Дзейнасць публічнага цэнтра прававой інфармацыі”, “Новае паступленне літаратуры”, “Што сёння карыстаецца попытам”);
- у інфармацыйнай папцы “Бібліятэка: інфармуе, прапануе, запрашае”;
- у рэкламных буклетах: “Бібліятэка-філіял № 3”, “Клуб “Гарадзенская лялька”;
- у візітках (аб рабоце бібліятэкі і дзейнасці клуба “Гарадзенская лялька”).

Адным з важных напрамкаў у рабоце з’яўляецца прасоўванне бібліятэчных інфармацыйных рэсурсаў у сацыяльных сетках. На старонцы бібліятэкі ў сетцы Facebook супрацоўнікамі штогод размяшчаецца каля 50 публікацый пра дзейнасць філіяла.

Для таго, каб старонка была папулярнай пастаянна павышаецца якасць інфармацыі, яна сістэматычна папаўняецца арыгінальнымі і цікавымі матэрыяламі, своечасова абнаўляюцца бібліятэчныя навіны.

Штогод матэрыялы пра дзейнасць бібліятэкі змяшчаюцца ў СМІ. Так, на рэгіянальным тэлебачанні прыгучалі рэпартажы пра дабрачынную акцыю клуба “Гарадзенская лялька” на карысць бяздомных жывёл, пра стварэнне экспазіцыі “Калядная батлейка” да свята Нараджэння Хрыстовага і адкрыццё выставы “Чаяванне ў Алісы” ў Музеі гісторыі Гарадніцы і інш. Неаднаразова загадчык бібліятэкі Сотнікава І.В. давала інтэрв’ю на тэлеканале “Гродна +”, дзе гаварыла пра дзейнасць публічнай бібліятэкі ў сучасных умовах і перспектывах яе развіцця, раіла гледачам цікавыя і карысныя выданні, якія можна пачытаць у вольны час.

Артыкулы пра дзейнасць установы змяшчаліся на старонках перыядычных выданняў (газеты “Перспектыва”, “Гродзенская праўда”, “Культура”).

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

За плённую працу і значны ўклад у развіццё бібліятэчнай справы ў Гродне загадчык бібліятэкі Сотнікава Іна Вісарыёнаўна неаднаразова была ўзнагароджана ганаровымі граматамі і дыпломамі ДУК “ЦБС г. Гродна” і аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Гродзенскага гарвыканкама.

У 2014 годзе Сотнікава І.В. стала пераможцай конкурсу прафесійнага майстэрства “Бібліятэкар года” сярод супрацоўнікаў ДУК “ЦБС г. Гродна”.

За лепшую арганізацыю работы ўстановы па выніках 2015 года бібліятэка-філіял № 3 стала пераможцай конкурсу “Бібліятэка года” .

Рашэннем адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна ад 22 красавіка 2015 г. № 187 Сотнікава І.В. занесена на дошку Гонару Кастрычніцкага раёна г. Гродна.

Бібліятэкары філіяла № 3 пастаянна знаходзяцца ў пошуку новых, нестандартных форм работы, распрацоўваюць цікавыя праграмы мерапрыемстваў, накіраваныя на папулярызацыю кнігі, прыцягненне да чытання карыстальнікаў і стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэчнай установы.Штогод дзейнасць бібліятэкі напоўнена феерверкам мерапрыемстваў розных жанраў і тэматыкі з улікам узросту і інтарэсаў чытачоў.

• • •

# ДАДАТКІ

**Дадатак №1**

## ЯК ПРЫВУЧЫЦЬ ДЗЯЦЕЙ ДА ЧЫТАННЯ

**(парады бібліятэкараў філіяла №3)**

## ПАВАЖАНЫЯ МАМЫ І ТАТЫ!

- Калі вы жадаеце, каб вашы дзеці чыталі – вы павінны самі чытаць, а яшчэ лепш – чытаць разам з дзецьмі, а яны – бачыць, як вы з задавальненнем трымаеце ў руках кнігу. Станьце для дзяцей прыкладам!

- З самага ранняга дзяцінства чытайце дзецям вясёлыя, цікавыя казкі і вершы. Пажадана, каб кожны дзень у кагосьці з бацькоў была вольная гадзіна для сумеснага чытання з дзецьмі і абмеркавання з імі прачытанага.

- Расказвайце сваім дзецям пра карысць чытання. Паказвайце сувязь кнігі з поспехамі ў вучобе і іншых справах. Прыводзьце прыклады станоўчага ўздзеяння чытання на ваша асабістае жыццё ці жыццё іншых людзей.

- Звяртайце ўвагу дзяцей на выказванні знакамітых людзей пра чытанне: пісьменнікаў і паэтаў, акцёраў і журналістаў, спартсменаў і інш. Паднімайце прэстыж кнігі ў свядомасці дзяцей.

- Арганізуйце дома дзіцячую бібліятэку: набывайце кнігі і дарыце іх дзіцяці. Збірайце выданні на тэмы, якія вельмі захапляюць вашых дзяцей.

- Вызначце ў доме спецыяльнае ўтульнае месца для чытання.

- Падтрымлівайце сяброўства дзяцей з тым, хто шмат чытае.

- Радуйцеся кожнаму прачытанаму твору. Не прымушайце дзяцей чытаць хутка, больш увагі звяртайце на правільнасць чытання і інтанацыю.

- Выбірайце для першага чытання кнігі з яркімі малюнкамі, вялікім шрыфтам і захапляльным сюжэтам, за якім цікава сачыць. Спачатку дзецям лепш чытаць невялікія апавяданні.

- Развівайце ў вашых дзяцей вобразнае мысленне. Стымулюйце ў іх жаданне прадказваць развіццё падзей твора, уяўляць думкі герояў, працягваць напісанае.

- Падтрымлівайце чытанне дзіцяці ўголас дзеля таго, каб развіць яго навыкі і ўпэўненасць у сабе.

- Чытайце па чарзе адзін аднаму апавяданні ці смешныя гісторыі, разгадвайце з дзецьмі крыжаванкі, адгадвайце загадкі, малюйце літаратурных герояў.

- Выклікайце ў дзяцей жаданне чытаць праграмную літаратуру да пачатку вывучэння яе ў школе. Такім чынам, яны будуць падрыхтаваны да чытання на ўроках, што не выкліча ў іх негатыўных адносін да школьных твораў.

- Вучыце дзяцей карыстацца цытытамі з прачытанага, запамінайце вершы і ўрыўкі з твораў. У будучым гэтыя ўменні ўпрыгожыць і ўзбагацяць мову вашых дзяцей.

- Абмяркоўвайце з дзецьмі кнігі, якія вы разам чытаеце. Размаўляйце пра прачытане так, каб яны адчувалі сябе разумнымі. Часцей хваліце дзяцей за кемлівасць, падтрымлівайце ў іх упэўненасць у сабе. Успамінаючы пазней дзяцінства, яны абавязкова будуць памятаць моманты сумеснага з вамі чытання і гутарак, і гэта сагрэе іх сэрцы.

- Не прымушайце дзяцей чытаць замест гульні ці прагляду тэлеперадачы, дзеля таго, каб чытанне не выклікала ў іх негатыўных эмоцый.

- Прывучайце дзяцей беражліва адносіцца да кніг, вучыце, што марнаваць кнігі і маляваць у іх нельга.

- Заахвочвайце дзяцей да наведвання бібліятэкі і яе мерапрыемстваў. Бярыце іх з сабой, калі ідзяце ў бібліятэку. Вучыце дзяцей карыстацца бібліятэчнымі фондамі і даведачным апаратам.

- Кансультуйцеся з бібліятэкарамі пры выбары дзіцячай літаратуры, давярайце іх рэкамендацыям.

**Дадатак №2**

# КНІГІ, ЯКІЯ НЕАБХОДНА ПРАЧЫТАЦЬ У ДЗЯЦІНСТВЕ

**(рэкамендацыі бібліятэкараў філіяла №3)**

## Творы беларускіх аўтараў:

- “52 февраля” (А. Жвалевский/ Е. Пастернак);
- “Время всегда хорошее” (А. Жвалевский/ Е. Пастернак);
- “Гимназия № 13” (А. Жвалевский/ Е. Пастернак);
- “Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца” (А. Бадак);
- “Ведзьміна тоня” (В. Гапееў);
- “Казкі астранаўта” (Р. Баравікова);
- “Казкі дзядулі Дняпра” (Г. Аўласенка);
- “Пацучок Фэлік падарожнічае” (А. Масла);
- “Шчарбаты талер” (А. Федарэнка);
- “Урокі першага кахання” (В. Гапееў).

## Творы замежных аўтараў:

- “Вафельное сердце” (М. Парр);
- “Лето Мари-Лу” (С. Каст);
- “Мама Му” (Ю. Висландер);
- “Мохнатый ребенок” (М. Аромштам);
- “На качелях между холмами” (М. Самарский);
- “Облачный полк” (Э. Веркин);
- “Остров в море” (А. Тор);
- “Сахарный ребёнок” (О. Громова);
- “Хранилище ужасных слов” (Э. Барсело);
- “Хранитель времени” (Б. Селзник).